**ВОДЗЫЎ**
на аўтарэферат дысертацыі
на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія

***А.А. КАРП***

**“БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ КРЫТЫКА ПЕРШАЙ ТРЭЦІ ХХ СТАГОДДЗЯ: ЭСТЭТЫЧНЫ ДЫСКУРС”**

Характэрнай тэндэнцыяй літаратуразнаўства ў апошнія гады з'яўляецца імкненне да сістэматызацыі і парадкавання тэрміналагічнага апарата, што датычыцца і праблемнага поля літаратурнай крытыкі ХХ стагоддзя. Пастаяннае абнаўленне тэрміналогіі, якое суправаджае развіццё любой навукі, непазбежна звязана з сыходам на перыферыю адных паняццяў і актуалізацыяй іншых, са з'яўленнем рознага ўзроўню класіфікацый, стварэннем навацыйных тыпалагічных мадэляў. У гэтым святле зварот да крытычных прац М. Багдановіча, В. Ластоўскага, С. Палуяна, А. Луцкевіча, Л. Гмырака, М. Гарэцкага, А. Бабарэкі, Ант. Адамовіча, Я. Коласа і інш. дазваляе, безумоўна, прасачыць асаблівасці генезіса і функцыянавання і “новай” беларускай літаратуры, і эстэтычныя і паэтычныя прынцыпы яе асэнсавання ў крытыцы.

У цэнтры працы А.А. Карп знаходзіцца комплекснае даследаванне менавіта эстэтычнага дыскурсу беларускай літаратурнай крытыкі першай трэці ХХ стагоддзя. Вядома, што станаўленне і сцвярджэнне такога падыходу, як слушна заўважае даследчык, мела пэўныя складанасці, плённы аналіз якіх належным чынам распачынае суіскальнік. А.А. Карп, разглядаючы беларускую літаратурную крытыку першай трэці ХХ стагоддзя, карыстаецца дыяхранічным падыходам, скрупулёзна прасочвае рост крытычнай і эстэтычнай думкі, робіць пераканаўчую спробу вызначыць атрыбутыўныя асаблівасці прадмета даследавання, устанавіць стратэгіі “нацыянальнага канона” ў крытыцы.

Наватарства даследавання падмацоўваецца зваротам да значнага корпуса крытычных выступленняў цэлага шэрага аўтараў і публікацый найбольш вядомых выданняў першай трэці ХХ стагоддзя (“Наша ніва”, “Полымя”, “Маладняк”, “Узвышша”). Уяўляецца каштоўным, што А.А. Карп сабрала багаты фактычны матэрыял пра дзейнасць беларускіх майстроў крытыкі, творы некаторых з якіх не ўводзіліся ў шырокі навуковы ўжытак, выкарыстала комплексны, шматвектарны падыход да выяўлення

заканамернасцяў функцыянавання айчыннай эстэтычнай крытыкі ў шырокім культуралагічным і агульнафіласофскім кантэксце.

Хацелася б удакладніць: даследуючы некаторыя ўзаемасувязі беларускай, а таксама рускай і ўкраінскай крытыкі перыяду першай трэці XX стагоддзя, суіскальнік не гаворыць пра канвергентныя сыходжанні некаторых палажэнняў беларускіх крытыкаў і іх заходнееўрапейскіх калег – майстроў прыгожага пісьменства. Ці ёсць перспектывы падобнага даследавання?

Дысертацыйнае даследаванне “Беларуская літаратурная крытыка першай трэці XX стагоддзя: эстэтычны дыскурс” адрозніваецца актуальнасцю, навізной, аргументаванасцю выкладу. Дысертант заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.01.08 – тэорыя літаратуры. Тэксталогія.

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры рускай літаратуры і журналістыкі
ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны
універсітэт імя А. С. Пушкіна» Садко Л. М.

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»
АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Подпіс Садко Л.М. пацвярджаю
Нач. АК БрДУ

Водзыў паступіў у савет па абароне дысертацый Д 01.42.04 20.03.2023 г.
Вучоны сакратар савета (Богран А.І.)

З водзывам азнаёмлена А. Карп (Карп А.А.)
20.03.2023 г.